*Ірына Цэван*

# РЭСПУБЛІКАНСКІЯ ФЕСТЫВАЛІ МІНШЧЫНЫ

Своеасаблівым паказчыкам распаўсюджанасці і запатрабаванасці дзіцячых фальклорных калектываў у культурным жыцці Міншчыны і краіны ў цэлым з'яўляюцца шматлікія фестывалі, агляды, конкурсы, святы музычнага і фальклорнага мастацтва, якія дэманструюць творчыя дасягненнісферы народнай творчасці і адначасова выяўляюцьнадзённыя праблемы і тэндэнцыі развіцця.

Асаблівае месца займаюць рэспубліканскія фестывалі, звязаныя, у першую чаргу, з музычным фальклорам і народнай творчасцю, і даступныя для ўдзелу дзіцячых фальклорных калектываў. У агульным сэнсе фестываль(ад лацінскага «festivus»– вясёлы, святочны) абазначае масавае свята, якое ўключае паказ дасягненняў у галіне музыкі, тэатра, кіно, эстрады цырка [1, с.398].

Фестывалі народнай творчасці, фальклорныя і іншыя фестывалі Міншчыны маюць сваю спецыфіку. Гэта, перш за ўсё, грамадска-культурныя, мастацкія акцыі, скіраваныя на захаванне і прапаганду гісторыка-культурнай спадчыны, адраджэнне, актуалізацыю і падтрымку традыцыйных і сучасных форм народнага мастацтва як часткі нацыянальнай культуры.У іх пералік уваходзяць такія асноўныя мерапрыемствы, як«Пеўчае поле», «Беларусь – мая песня», «Сярэбраны звон цымбалаў», «Дажынкі», фестываль беларускай песні і паэзіі.

Рэспубліканскі фестываль харавых калектываў «Пеўчае поле» ў г.Мядзелі традыцыйна збірае аматараў харавога мастацтва.Яго праграма ўключае: урачыстае адкрыццё фестывалю,выступленні з удзелам аматарскіх калектываў і ансамбляў песні ўстаноў культуры вобласці, рэспублікі і краін блізкага замежжа, выставы-кірмашы вырабаў народных майстроў, гандлёвыя рады, атракцыёны для дзяцей, тэатралізаваныя шэсці калектываў-удзельнікаў і гасцей фестывалю, канцэртную праграму з удзелам Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору РБ імя Г.І.Цітовіча, святочны феерверк, конкурсную праграму з удзелам узорных і народных калектываў, узнагароджанне пераможцаў, гала-канцэрт і закрыццё свята. Апагеем свята звычайна становіцца выступленне тысячагалосага хору, які складаецца з усіх калектываў-удзельнікаў, і ўхваляе нашу краіну.

Усебеларускі фестываль народнага мастацтва «Беларусь – мая песня» заснаваны як рэспубліканскі, сучасную назву атрымаў у 2003 г. Фестываль мае рэспубліканскі (праходзіць у Мінску), рэгіянальны і раённы этапы. Асноўныя задачы фестывалю – павышэнне сацыяльнай ролі і ідэйна-мастацкага ўзроўню народнай творчасці, яе ўплыву на развіццё грамадскай і працоўнай актыўнасці насельніцтва Беларусі, даследаванне, аднаўленне, пераемнасць лепшых мастацкіх традыцый, распаўсюджванне рэгіянальнага народнага і развіццё нацыянальнага мастацтва ў розных яго формах. У рэгіёнах праходзяць канцэрты, спектаклі, тэатралізаваныя прадстаўленні, раённыя, гарадскія і абласныя агляды-конкурсы аматарскай творчасці, выстаўкі народнага мастацтва. Фестываль «Беларусь – мая песня» з удзелам творчых калектываў усіх рэгіёнаў рэспублікі з'яўляецца адным з самых маштабных. Прымаюць удзел дарослыя і дзіцячыя аматарскія калектывы, артысты, культурныя аб'яднанні нацыянальных меншасцей, грамадскія арганізацыі і творчыя саюзы, прадстаўнікі беларускай замежнай дыяспары. Праграма заключных мерапрыемстваў уключае выступленні творчых дэлегацый абласцей у сталіцы, узнагароджванне пераможцаў і святочны гала-канцэрт.

Рэспубліканскі фестываль цымбалістаў «Сярэбраны звон цымбалаў» праводзіцца раз у 2-3 гады. Першы фестываль адбыўся ў 1998 г. у Мінску, усе наступныя, пачынаючы з 2000г., – у Маладзечне на базе музычнага вучылішча імя М.Агінскага. З цягам часу фестываль стаў сапраўдным святам нацыянальнага мастацтва. Адборачныя абластныя туры, якія ладзяць рэгіянальныя аддзяленні Асацыяцыі беларускіх цымбалістаў разам з мясцовымі аддзеламі культуры і адукацыі, вызначаюцца масавасцю і высокім узроўнем падрыхтоўкі ўдзельнікаў. Праграмы фестывалю насычаныя, яны ўключаюць конкурсы салістаў і ансамбляў музычных вучылішч, каледжаў, дзіцячых школ мастацтваў і сярэдніх школ з музычным напрамкам, навукова-практычныя канферэнцыі, майстар-класы, канцэрты вядучых калектываў і цымбалістаў рэспублікі і замежжа.

Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі» з рэспубліканскім размахам ладзіцца з 1996 г. Традыцыйна ён уключае ўрачыстае адкрыццё, цырымонію ўручэння прэмій пераможцам рэспубліканскага спаборніцтва па ўборцы зерневых культур, дзяржаўных узнагарод, гала-канцэрт з калектыўных і сольных мастацкіх нумароў ад удзельнікаў вобласці, якая праводзіць свята, святочны феерверк. Кожны год «Дажынкі» ладзяцца ў новым горадзе. У Мінскай вобласці праходзяць раз у 6 год. Традыцыйна праходзяць канцэртныя выступленні дзіцячых і дарослых фальклорных калектываў вобласці, святочнае шэсце ўдзельнікаў фестывалю-кірмашу. Ладзяцца фальклорныя падворкі дзіцячых школ мастацтваў, спектаклі лялечных тэатраў, танцавальныя праграмы, выставы караваяў і хлебабулачных вырабаў, выставы-продажы тавараў для дзяцей, кніг і часопісаў беларускіх выдавецтваў, перыядычных выданняў, сувенірнай прадукцыі, майстар-класы і творчыя прэзентацыі розных відаў рамёстваў, гульнявыя праграмы, тэматычныя вакальна-харэаграфічныя і тэатральныя кампазіцыі, радыётрансляцыі, святы беларускай моды, спартыўныя праграмы, вернісажы мастакоў, турніры асілкаў і інш.

Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне з'яўляецца адным з найбольш значных фестываляў, якія вызначаюць культурную прастору сучаснай Беларусі. Фестываль створаны ў 1993 г., да 2011 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праходзіў раз у два гады, з 2011 г. ладзіцца штогод. Традыцыйна на ім гучыць беларускае слова, шырока прадстаўлена нацыянальная паэзія і музыка розных пакаленняў, гучаць песні беларускіх аўтараў, выступаюць заслужаныя і маладыя беларускія паэты. У праграму фестывалю, як правіла, уваходзяць выступленні Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору РБ імя Г.І.Цітовіча, камерных калектываў Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі РБ. У 2001 г.на фестывалі беларускай песні і паэзіі з'явіўся юбілейны каляндар, звязаны з лёсам кампазітараў, паэтаў, спевакоў і музыкантаў.Ужо прайшлі: першы вялікі фестывальны канцэрт у 2001 г., названы радком з верша знакамітага беларускага паэта Ў.Дубоўкі «О, Беларусь, мая шыпшына»; пралогам юбілейнага фестывалю ў 2003 г. сталі словы з верша беларускага паэта Ў.Жылкі «Беларусь, на цябе я малюся!»; 60-годдзю Вялікай Перамогі была прысвечана фестывальная праграма 2005 г. і яшчэ адной прэм'ерай фестывалю стаў тэатралізаваны паказ з удзелам беларускіх паэтаў і кампазітараў, у якім прагучалі новыя песні на вершы Ў.Караткевіча; у 2007 г. фестываль быў прымеркаваны да 125-годдзя з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Я.Купалы і Я.Коласа; у 2009 г. прайшоў пад знакам 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; фестываль 2011 г. быў прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння народнага артыста СССР і Беларусі Ў.Мулявіна; фестываль 2012 г. быў прысвечаны 130-годдзю Я.Купалы і Я.Коласа. У святочныя дні на Цэнтральнай плошчы Маладзечна праходзяць выступленні дзіцячых і дарослых аматарскіх калектываў Міншчыны, каля канцэртнай пляцоўкі працуе Горад майстроў, дзе народныя ўмельцы прадстаўляюць выставу-продаж сваіх вырабаў з саломы, лазы, дрэва, скуры.

Фестываль народнай творчасці «Сузор'е» праводзіцца ў г. Мінску ў мэтах: павышэння сацыяльнай ролі і ідэйна-мастацкага ўзроўню народнай творчасці, яе ўплыву на развіццё грамадскай і працоўнай актыўнасці насельніцтва Мінска; шырокага далучэння дарослых і дзяцей да заняткаў народным мастацтвам; развіцця ў працоўных калектывах, навучальных, культурна-асветніцкіх і пазашкольных установах, аматарскіх калектывах розных відаў і жанраў народнага мастацтва, гурткоў, студый, майстэрняў; удасканалення сістэмы і абагачэння формаў эстэтычнага і мастацкага выхавання навучэнцаў агульнаадукацыйных школ, студэнцкай і працоўнай моладзі; арганізацыі вольнага часу жыхароў г. Мінска; абагачэння рэпертуару аматарскіх калектываў творамі высокага ўзроўню народнага мастацтва, беларускіх аўтараў; павышэння ўзроўню выканальніцкага майстэрства і сцэнічнай культуры калектываў народнай творчасці, стварэння спрыяльных умоў для развіцця іх творчай дзейнасці, супрацоўніцтва майстроў прафесійнага і аматарскага мастацтва; падтрымкі творча адораных выканаўцаў, кампазітараў, балетмайстраў, хормайстраў; папулярызацыі лепшых узораў музычнага, тэатральнага, харэаграфічнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, відэа, фота і іншых відаў і жанраў нацыянальнага мастацтва. У межах фестывалю «Сузор'е» па асобным плане праводзяцца фестывалі і святы «Не старэюць душой ветэраны», «Яднанне», «Белая Русь», «Мінскі гармонік» і інш.

Такім чынам, у г. Мінску і Мінскай вобласці праходзяць мастацкія мерапрыемствы рэспубліканскага ўзроўню; фестывалі і конкурсы фальклору, народнай творчасці, музычнага мастацтва Міншчыны даступныя для ўдзелу дзіцячых мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку. Фестывалі накіраваны на захаванне і развіццё нацыянальнай культуры, спрыяюць павышэнню мастацкага ўзроўню і колькасці дзіцячых фальклорных калектываў. Асноўнымі мэтамі і задачамі правядзення рэспубліканскіх фестываляў з'яўляюцца актывізацыя канцэртнай дзейнасці дзіцячых калектываў устаноў культуры і адукацыі, далучэнне дзяцей і моладзі да лепшых узораў мастацкай творчасці, стварэнне неабходных умоў для развіцця і самарэалізацыі здольнасцей удзельнікаў у розных мастацкіх кірунках,эстэтычнае развіццё.

**Спіс літаратуры:**

Фестываль // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5 т. Т. 5 : Скамарохі – Яшчур / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелСЭ, 1987. – С. 398.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ